**Гульня-падарожжа па казцы “Рэпка” ў малодшай рознаўзроставай групе**

**Наталля Васільеўна Апалонік,**
выхавальнік дашкольнай адукацыі
другой кваліфікацыйнай катэгорыі
Любчанскага дзіцячага сада
Навагрудскага раёна

**Казка “Рэпка” цікавая дзецям сваім простым, але займальным сюжэтам, рытмам, які лёгка запамінаецца, і магчымасцю ўдзелу ў дзеянні. Акрамя таго, яна вучыць каштоўнасці дружбы, узаемадапамогі і каманднай працы, паказваючы, што нават самыя маленькія могуць зрабіць унёсак у агульную справу.**

**Задачы:** фарміраваць уменне дзяцей уважліва слухаць казку да канца; працягваць вучыць адказваць на пытанні выхавацеля; замацоўваць веданне геаметрычных фігур (круг, квадрат, трохвугольнік, авал) і веданне колераў; працягваць развіваць маўленне, узбагачаць слоўнік дзяцей словамі: вялікія-маленькія, сябры; развіваць памяць дзяцей, дробную маторыку рук, каардынацыю рухаў; выхоўваць добразычлівыя адносіны адзін да аднаго.

**Метады і прыёмы:**

наглядны: паказ, дэманстрацыя;

славесны: мастацкае слова, гутарка, пытанні, тлумачэнні;

гульнёвы: сюрпрызны момант, дыдактычныя гульні, драматызацыя.

**Матэрыялы да заняткаў:**

фігуры герояў казкі на магнітах: рэпка, дзед, бабка, унучка, сабачка, кошка, мышка, гузікі рознага памеру і колеру, прышчэпкі, сушылка для бялізны, кубачкі і талерачкі рознага колеру, магнітная дошка, медалькі ў выглядзе рэпкі, карцінкі-размалёўкі, пазлы.

**Ход гульні**

**Выхавальнік:** Дзеці, сёння мы з вамі адправімся ў казачнае падарожжа. Ёсць у мяне чароўны цягнічок для нашай вандроўкі на казачную паляну. *(Гучыць песня “Паравозік з Рамашкава”. Муз. А. Шаумарава, сл. У. Ільічова.)* Дзеці строяцца ў “цягнічок” і пад музыку “едуць” на паляну.

**Выхавальнік:** Вось мы і прыехалі ў госці да казкі. *(Музыка У. Дашкевіча “У гасцях у казкі” .)*

– Дзеткі, чуеце? Гэта наша казка спяшаецца да нас. Закрыем вочкі – і з'явіцца казка!

*Выхавальнік з дзецьмі знаходзяць куфэрак.*

**Выхавальнік:** Паглядзіце! Гэта казачны куфэрак. Тут жыве наша казка. Жадаеце паглядзець і пазнаць, якая? Ой, не адчыняецца куфэрак! Зразумела, куфэрак адкрыецца, калі вы адгадаеце назву казкі, якая там жыве. Слухайце загадку пра казку, у якую мы трапілі.

Унучка, Жучка,
Кошка, Мышка
Дзеду з Бабкай дапамагалі,
На агародзе ўсе былі. *(Казка "Рэпка".)*

Малайцы, правільна адгадалі загадку.

**Сюрпрызны момант**

– Вось наш куфар і адкрыўся.

**Гульня "Цудоўны куфар"**

*Выхавальнік прапануе кожнаму дзіцяці па чарзе выбраць фігурку пэўнага героя казкі.*

**Выхавальнік:** Дзеці, давайце ўспомнім гэтую казку.

*Выхаванцы ля магнітнай дошкі разам з педагогам пачынаюць расказваць казку.*

– Пасадзіў Дзед рэпку *(выставіць фігурку дзеда і г.д.)*, вырасла рэпка вялікая-вялікая. Стаў Дзед рэпку цягнуць, цягне, пацягне, выцягнуць не можа. Стаў ён Бабку клікаць.

*Дзеці клічуць Бабку. Выхавальнік бярэ ў рукі фігурку Бабкі.*

**Дыдактычная гульня "Знайдзі латку"**

**Бабка:** Добры дзень, дзеці. Я б дапамагла дзеду, ды вось яму сабралася адзенне залатаць, я вельмі занятая, не магу дапамагчы.

**Выхавальнік:** Дзеці, што будзем рабіць, як нам быць? *(Адказы дзяцей.)*

– Давайце дапаможам бабулі.

*На падносе ляжаць геаметрычныя фігуры ("латкі), дзеці накладваюць іх і вызначаюць тыя, якія падыходзяць для "рамонту" адзення.*

**Выхавальнік:** Дзеці, а якія геаметрычныя фігуры нам спатрэбіліся? Якога яны колеру, памеру? *(Адказы дзяцей.)*

– Малайцы, дзеткі, справіліся з гэтым заданнем

**Бабка:** Дзякую за дапамогу, дзеткі! Дапамагу дзеду рэпку цягнуць.

**Выхавальнік і дзеці:** Бабка – за дзедку, дзедка – за рэпку, цягнуць, пацягнуць, выцягнуць не могуць! Паклікала бабка каго?

**Дзеці:** Унучку.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*З'яўляецца фігурка Унучкі.*

**Унучка:** Добры дзень, дзеці. Я б дапамагла дзеду, ды вось хустачкі памыла, трэба іх развесіць на вяроўку сушыцца. Я вельмі занятая, не магу дапамагчы дзядулі.

**Выхавальнік:** Дзеці, давайце дапаможам Унучцы.

**Дыдактычная гульня «Прышчэпкі»**

*Дзяўчынкі развешваюць хустачкі ў кветачкі, а хлопчыкі – у гарошак.*

**Унучка:** Якая я буду прыгожая ў чыстай хустачцы, дзякуй вам, пайду дапамагу рэпку цягнуць!

**Выхавальнік і дзеці:** Унучка – за бабку, бабка – за дзедку, цягнуць, пацягнуць, выцягнуць не могуць. Паклікала ўнучка Жучку!

**Унучка:** Жучка! А-ну, дапамагай!

Дарма хвастом тут не віляй!

*З'яўляецца фігурка Жучкі.*

**Жучка:** Вы мяне клікалі? Але я яшчэ гуляю, пагуляйце са мной.

**Карагодная гульня "Рэпка" з імітацыяй руху**

Вось мы рэпку пасадзілі *(імітацыя руху)*
І вадой яе палілі *(імітацыя руху)*.
Новы дзень за днём ідзе *(імітацыя руху)*,
Наша рэпанька расце *(імітацыя руху)*.
Вось такой вышыні *(імітацыя руху)*,
Вось такой шырыні *(імітацыя руху)*.
Слаўны вырас ураджай *(імітацыя руху)*,
Мы здзівілі ўвесь край.

**Жучка:** Дзякуй вам, дзеткі, за гульню! Пайду дапамагу рэпку цягнуць!

**Выхавальнік і дзеці:** Жучка – за ўнучку, унучка – за бабку, бабка – за дзедку, дзедка – за рэпку, цягнуць, пацягнуць, выцягнуць не могуць! Стала Жучка клікаць Кошку.

**Кошка:** Я гасцей чакаю, посуд памыла, але не расставіла!

**Выхавальнік:** Дапаможам Кошцы, дзеткі?

*Дзеці растаўляюць кубачкі на талерачкі па колеры.*

**Кошка:** Дзякуй вам, дзеткі! Пайду дапамагу рэпку цягнуць!

**Выхавальнік і дзеці:** Кошка – за Жучку, Жучка – за ўнучку, унучка – за бабку, бабка – за дзедку, дзедка – за рэпку, цягнуць, пацягнуць, выцягнуць не могуць. Паклікала Кошка Мышку.

**Кошка:** А-ну, Мышка, не зяхай, рэпку цягнуць дапамагай!

*Выстаўляецца фігурка Мышкі.*

**Мышка:** Я, вядома, дапамагу, ды вось хацела на сарафан гузік прышыць, ды рассыпала, а сабраць не магу.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Выхавальнік:** Дзеткі, давайце дапаможам мышцы сабраць гузікі.

**Гульня "Папялушка"**

**Выхавальнік і дзеці:** Мышка – за кошку, кошка – за Жучку, Жучка – за ўнучку, унучка – за бабку, бабка – за дзедку, дзедка – за рэпку, цягнуць, пацягнуць і выцягнулі рэпку.

**Выхавальнік:** Вось і скончылася наша казка. Дапамаглі мы, дзеткі, рэпку выцягнуць? Дзеці, трэба заўсёды дапамагаць адно аднаму. І тады ўсё атрымаецца! Ну а за гэта героі казкі дораць вам вось такія медалькі ў выглядзе рэпкі! А нам час вяртацца ў сад.

**Выхавальнік:** Дзеці, у якую казку мы гулялі? Якія героі былі ў казцы? Яны былі сябрамі? Вам спадабалася? Але нам час вяртацца ў дзіцячы садок.

*Дзеці строяцца "паравозікам", гучыць песня "Паравозік з Рамашкава".*

**Выхавальнік:** Дзеці, давайце падорым сваім сябрам з суседняй групы карцінкі-размалёўкі.

*Малодшыя дзеці сыходзяць. А для старэйшых выхаванцаў прапануецца заданне ў групе "Складзі з частак цэлае". Дзеці складаюць пазлы з выявай рэпкі.*

**Літаратура**

1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

2. Касянюк, Р.Р. Казка «Рэпка»: слухай, расказвай, гуляй: вучэбны наглядны дапаможнік для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі. – Мінск : Аверсэв, 2016.

3. Залатая скарбонка: Хрэстаматыя для дашкольнікаў. – Мінск : Аверсэв, 2021.

4. Дзецям аб казках. Адукацыйная галіна "Мастацкая літаратура" З. Кандрацюк, В. Тукач. – Мінск : Экаперспектыва, 2024.